**У гасцях у аддзяленні дзённага знаходжання інвалідаў
ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна»
кінолагі са службовымі сабакамі**

27 кастрычніка 2021 г. да выхаванцаў аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў ДУ «ТЦСАН Ашмянскага раёна» у госці прыехалі прадстаўнікі кіналагічнага цэнтра Смаргонскай пагрангрупы са сваімі чацвераногімі сябрамі.

Кінолагі на практыцы дэманстравалі гледачам пошукавыя ўменні службовых сабак, чым даказвалі, што падмануць натрэніраваны сабачы нос немагчыма.

Прадстаўнікі кіналагічнага цэнтра Смаргонскай пагранічнай групы прадэманстравалі паказальнае выступленне службовых сабак людзям з абмежаванымі магчымасцямі.

Хлопцы задавалі пытанні па распарадку дня кінолагаў, па навучанні і выхаванні сабак, па дрэсіроўцы сваіх хатніх гадаванцаў і шмат іншых пытанняў. Падчас сустрэчы атрыманы вычарпальныя адказы. Зносіны з дрэсіраванымі сабакамі пакінула шмат станоўчых эмоцый і ўражанняў.











